7. *Сержпутоўскі, А. К.* Палешукі-беларусы : этнаграфічны нарыс / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 173 с.

8. *Свешникова, Т. И.* К функции посуды в восточно-романском фольклоре / Т. И. Свешникова, Т. В. Цивьян // Этническая история восточных романцев: древность и средние века. – М., 1979. – С. 147–195.

І. Н. КОЛАБАВА

# МАНЕТНЫЯ СКАРБЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ПРУЖАНСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Утварэнне манетных скарбаў – гэта самы звычайны ў мінулым спосаб захоўвання грашовых сродкаў. Аб шырокім распаўсюджанні падобнага звычая інфармуюць шматлікія гістарычныя крыніцы.

На тэрыторыі Беларусі пачынаючы з XIX ст. зафіксавана адкрыццё больш за 1,5 тыс. грашовых скарбаў. Большасць з іх знаходзілася для зручнасці карыстання на невялікай глыбіні, належаць яны маглі прадстаўнікам самых шырокіх колаў насельніцтва. Геаграфічнае становішча беларускіх зямель і гістарычныя падзеі абумовілі стракаты склад грашовых дэпазітаў, а абставіны часта пазбаўлялі іх гаспадара магчымасці выкарыстаць назапашанае багацце пры жыцці.

Значную цікавасць уяўляе сабой упакоўка, у якой захоўваліся грошы. Гэта магло быць спецыяльна зробленае глінянае начынне, металічная ёмкасць ці проста кавалак тканіны, скуры і інш.

Грашовы скарб – гэта ўнікальная і непаўторная з’ява, у кожнага дэпазіта – свой «твар», які характарызуецца ўласнай храналогіяй, колькаснымі і якаснымі паказнікамі.

Даследаванне асноўных характарыстык такога феномена, як скарб, дае магчымасць адказаць на шэраг пытанняў гісторыі грашовага абарачэння, вызначыць склад грашовых сістэм, узровень эканамічнага, тэхнічнага, культурнага развіцця краіны ў адпаведныя перыяды, а таксама адсачыць міжнародныя гандлёвыя сувязі. Скарбы дазваляюць датаваць розныя прадметы, што былі знойдзены разам з манетамі.

Адкрыццё грашовага дэпазіту – заўсёды надзвычайная падзея, супадзенне выпадковасцей. Унікальнасць такога выбітнага помніка гісторыі і культуры, як грашовы скарб, патрабуе да сябе асабліва беражлівых адносінаў.

Скарбы з’яўляюцца своеасаблівымі рэгулятарамі грашовага абарачэння. Функцыянаванне рынкавых адносінаў патрабуе пэўнай грашовай сумы. У выпадках, калі гэтая грашовая маса перавышае патрэбы рынку, скарбы адцягваюць «залішнія» грошы ў рэзерв і наадварот – пры неабходнасці папаўняюць грашовую масу.

Навуковае даследаванне манетнага дэпазіта – працэс даволі складаны. Пры атрыбуцыі манет вызначаецца іх дзяржаўная прыналежнасць, эмітэнт, манетны двор, намінал, дата чаканкі, метралагічныя і якасныя характарыстыкі. Час захавання скарбу ўмоўна звязаны з годам чаканкі наймалодшай манеты з яго складу. Зразумела, што больш дакладная датыроўка павінна ўлічваць шэраг дадатковых момантаў. Напрыклад, пры адсутнасці прытока больш позніх эмісій, пэўныя манеты маглі прысутнічаць у абарачэнні даволі доўгі час пасля іх выпуску.

Грунтоўнае нумізматычнае даследаванне не можа абыходзіцца без даных пісьмовых крыніц і аналізу тапаграфіі знаходак скарбаў ці асобных манет.

Пры першаснай класіфікацыі дэпазіт вызначаецца як грашовы, грашова-рэчавы ці рэчавы. У працэсе далейшага вызначэння ён можа быць аднесены да адной з наступных падгруп, напрыклад скарбаў страчаных (якія аказаліся ў сховішчы насуперак волі ўладальніка), зваротных (захаваных з намерам іх выкарыстання ў будучым), незваротных (культавыя ахвяраванні), кароткатэрміновага накаплення (асабістыя), доўгатэрміновага накаплення (княскія, манастырскія, купецкія ці разбойніцкія зберажэнні), надзвычайных абставінаў, фальшывых манет і інш.

Тэма скарбаў знайшла адлюстраванне ў мастацкай літаратуры і фальклоры. У народных паданнях грашовыя скарбы падзяляюцца на «злыя» і «добрыя», якія ахоўваюць адпаведныя сілы (палявік, лесавік, багнік, скарбнік, бялун, купальскі дзядок). Для пошукаў скарбаў выкарыстоўвалі рукапісныя кнігі –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Траўнікі», «Вызыўныя кнігі» і «Роспісы», у якіх утрымліваліся парады для шукальнікаў скарбаў.

Прыблізна палова ад усяго вядомага аб'ёму адкрытых на тэрыторыі Беларусі на працягу XIX–XXI стст. грашовых скарбаў па розных прычынах адсутнічае на наш час у музейным фондзе краіны і застаецца толькі зафіксаванай на старонках пісьмовых крыніц.

З сярэдзіны XIX ст. выяўленыя грашовыя дэпазіты пачалі рэгістравацца Імператарскай археалагічнай камісіяй (1859–1918). Найбольш цікавыя манеты са скарбаў па рашэнні камісіі перадаваліся ў музейныя калекцыі, за што знаходчык атрымліваў адпаведнае ўзнагароджанне, а астатняя частка дэпазіту ў залежнасці ад абставінаў ці вярталася знаходчыку, ці ішла на пераплаўку на манетны двор. У асобных выпадках дублетныя экзэмпляры з дзяржаўных музейных нумізматычных калекцый прадаваліся прыватным збіральнікам.

У наш час найбольш значныя калекцыі грашовых і грашоварэчавых скарбаў захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, Нумізматычным кабінеце Белдзяржуніверсітэта, Музеі грошай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

На тэрыторыі Пружанскага раёна зафіксаваны знаходкі манетных скарбаў розных перыядаў гісторыі грашовага абарачэння Беларусі.

**Пружанскі р-н, Брэсцкая вобл.**

Скарбы перыяду рымскага дэнарыя (кан. II – пач. V ст.)

1. был. маёнтак Булгарына (знаходзіўся ў в. Чахец), пры агародных работах да 1845 г. знойдзена 1 медная манета Рымскай імперыі [3, с. 213–214, № 15; 1, с. 269].

2. г. Пружаны, год ?, 1 медная манета Рымскай імперыі [3, с. 214, № 16; 1, с. 269].

3. в. Чахец, да 1838, «при копании пруда найдено несколько римских монет…» [2, с. 68–69].

**Скарбы XVI ст.**

4. в. Рачкі, 1960. На глыбіні 0,2–0,3 м у гліняным начынні В. С. Залескім знойдзены скарб. Вядома 550 срэбных манет. Вялікае Княства Літоўскае (дэнарыі, падвоеныя дэнарыі, паў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грошы), Каралеўства Польскае (паўгрошы), Прусія (грошы), г. Свідніца (паўгрош) [3, с. 317, № 208; 1, с. 269].

**Скарбы XVII ст.**

5. в. Наскі, 1910. «И. И. Стабровски на берегу р. Ясельды найдено около 1 кг шведских, польских, литовских монет…». У пасляваенныя гады скарб перададзены знаходчыкам у Слонімскі раённы краязнаўчы музей [3, с. 376–377, № 420; 1, с. 269].

Даведка: Іосіф Іосіфавіч Стаброўскі (1870–1968), палкоўнік рускай арміі, член-карэспандэнт Віленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага таварыства, стваральнік краязнаўчага музея ў г. Слоніме.

6. г. п. Ружаны, тэрыторыя Ружанскага палацавага комплексу, пры рэстаўрацыйных работах у 2008–2011, 1067 медных манет, Вялікае Княства Літоўскае, Каралеўства Польскае (соліды).

**Скарбы XIX ст.**

7. в. Заполье, 1902, 26 манет Расійская імперыя (10, 25 капеек), Рэч Паспалітая (4-грашовікі, 8-грашовік), Герцагства Варшаўскае (1/6 талера, 1/3 талера), Каралеўства Польскае (злотыя, падвоеныя злотые), Прусія (4-грашовікі, 1/8 талера). Срэбра. [3, с. 495–496, № 573; 1, с. 269].

**Недатаваны скарб, невядомага складу**

8. в. Варажбіты, год?, ва ўрочышчы «Маньков пруд» знойдзены «лет тридцать тому назад… до полугарнца старинных серебряных монет» [3, с. 503, № 924].

---

1. *Колобова, И. Н.* Монетные клады на территории Брестской области / И. Н. Колобова // Брест. Энциклопедический справочник. – Мінск, 1987. – С. 265–269.

2. *Мельникова, А. А.* Находки монет античного мира в Беларуси (материалы) / А. А. Мельникова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. – Вып. 4. – Мінск, 2008. – С. 67–76.

3. *Рябцевич, В. Н.* Топография монетных кладов на территории Белоруссии: автореф. дис. ... канд. истор. наук / В. Н. Рябцевич ; Ин-т археологии АН СССР, Ленингр. отд-ние. – Л., 1965. – 20 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ